Говін С.В.
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, hist_journ@tut.by*

# Да пытання арганізацыі газеты «Звезда». Распаўсюджванне выданнем сацыял-дэмакратычнай думкі ў Беларусі (жнівень – кастрычнік 1917 г.)

27 лютага 1917 г.[1] у Петраградзе быў арганізаваны Часовы камітэт IV Дзяржаўнай думы, які ўзяў на сябе абавязкі кіруючага органа ў Расіі. Ён дэ-факта быў прызнаны кіраўнікамі Вялікабрытаніі і Францыі. 2 сакавіка Мікалай II адрокся ад прастола, у гэты ж дзень па дамоўленасці з Петраградскім Саветам быў створаны Часовы ўрад з выканаўча-распарадчымі і заканадаўчымі абавязкамі. Упершыню ў сваёй гісторыі Расія стала дэмакратычнай рэспублікай (афіцыйна аб’яўлена Часовым урадам 1 верасня 1917 г. – С. Г.).

У 1917 г. ад Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі да Кастрычніцкай прайшло ўсяго дзевяць месяцаў, але гэтулькі гістарычных падзей упісалася за гэты час у палітычнае жыццё краіны, паўплываўшых нават на змену ў Расіі дзяржаўнага ладу.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі У. Ленін вярнуўся ў Расію, каб непасрэдна кіраваць барацьбой за стварэнне сацыялістычнай рэспублікі. РСДРП(б), іншыя левыя партыі, Саветы, прафсаюзы зноў, як і ў 1905–1907 гг., працягнулі дзейнасць, выйшаўшы з падполля. У Расіі ўстанавілася г.зв. «двоеўладдзе» – з аднаго боку Часовы ўрад, а з другога – Саветы рабочых, сялянскіх, салдацкіх дэпутатаў.

4 красавіка 1917 г. на нарадзе бальшавікоў У.Ленін выступіў з «Красавіцкімі тэзісамі», у якіх агучыў канкрэтныя шляхі пераходу ўлады ад Часовага ўрада да Саветаў. Але арганізаваныя бальшавікамі 10 і 18 чэрвеня мірныя дэманстрацыі працоўных Петраграда былі разагнаны вайскамі. Меліся ахвяры. Карціну жорсткіх мер Часовага ўрада ў адносінах да народа дапоўнілі падзеі 3–5 ліпеня. Партыйны лозунг «Уся ўлада Саветам!» бальшавікі вымушаны былі зняць, а РСДРП(б) зноў сыйшла ў падполле. VI з’езд РСДРП(б), які прайшоў 26 ліпеня – 3 жніўня ў Петраградзе, прыняў рашэнне аб падрыхтоўцы да ўзброенага паўстання. Негатыўную ролю ў прымяненні Часовым урадам новых рэпрэсій да бальшавікоў адыграў жнівеньскі ваенны мяцеж генерала Л. Карнілава, якога 18 ліпеня Часовы ўрад прызначыў Вярхоўным галоўнакамандуючым. Мэтай Л. Карнілава было ўстанаўленне ў Расіі ваеннай дыктатуры, але на барацьбу з карнілаўшчынай падняліся шырокія народныя масы. 30 жніўня ў Мінску пад кіраўніцтвам М. Фрунзе быў

[1] Тут і далей усе даты прыведзены па старым стылі.

арганізаваны Часовы рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту, асноўнай мэтай якога стала барацьба з мяцежнікамі.

Падзеі, якія адбываліся ў цэнтральнай Расіі, адразу ж так ці інакш знаходзілі водгук у Паўночна-Заходнім краі (з 1 верасня 1917 г. – Заходняя вобласць). Яны шырока асвятляліся ў друку. У 1917 г. у Беларусі выходзіла больш за 80 перыядычных выданняў партый, устаноў, арганізацый. Толькі ў Мінску іх было больш за 30. Найбольш вядомымі сталі: «Вестник Минского губернского комиссариата», «Известия Минского совета», «Крестьянская газета», «Социалист-революционер», «Фронт», «Минский голос», «Луч», «Грамада», «Минская жизнь»,«Вольная Беларусь», «Дэр Векэр» і інш.

Бальшавікі ў Беларусі ў 1917 г. не мелі свайго друкаванага выдання, яны шмат часу аддавалі вуснай агітацыйнай рабоце, а ў выпадку крайняй неабходнасці выкарыстоўвалі «Крестьянскую газету». Створаная па рашэнні I з’езда сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, яна на сваіх старонках публікавала матэрыялы па пытаннях аграрнай палітыкі, у тым ліку і бальшавікоў, аб нацыянальным пытанні, умацаванні саюза рабочага класа і сялянства, крытыкавала лідараў буржуазных партый, іх адносіны да палітычнага і эканамічнага жыцця ў Расіі, Часовы ўрад з яго дзеяннямі весці вайну да пераможнага канца. Падзеі ў краіне развіваліся настолькі імкліва, што ўдзел у «Крестьянской газеце» лідараў Мінскага камітэта РСДРП(б) іх ужо не задавальняў – патрэбны быў свой друкаваны орган. Не выратоўвалі і выданні ЦК РСДРП(б), якія рэгулярна дасылаліся з цэнтра. А між тым прэса кадэтаў, эсэраў, меншавікоў, іншых партый і ўстаноў, якая часам выходзіла нават у павятовых гарадах і мястэчках, усё часцей і часцей абрушвалася на бальшавікоў з крытыкай, а тыя не маглі ім нават адказаць.

Мінскія бальшавікі з канца мая 1917 г. ўжо працавалі ў г.зв. «аб’яднаным камітэце», але 4 ліпеня вымушаны былі пакінуць яго. Яны арганізавалі Мінскі камітэт РСДРП(б). А. Мяснікоў пазней успамінаў, што яшчэ з першых дзён чэрвеня некаторыя з іх падумвалі аб арганізацыі свайго друкаванага органа, але не вельмі верылі ў гэта па некалькіх прычынах: па-першае, яны не мелі сродкаў, каб запусціць у вытворчасць газету, а па-другое – не былі ўпэўнены, што іх газету тут будуць чытаць. «И все же, – пісаў ён, – все чаще и чаще эта мысль заставляла руководителей Минского комитета РСДРП(б) думать об этом: на Западном фронте «стояли массы измученных, исстрадавшихся, питавшихся надеждами солдат, совершенно не подпадавших под большевистскую агитацию, по всему фронту и краю были разбросаны сотни тысяч милитаризованных рабочих, крестьян-батраков, в Минске и в прифронтовой зоне работали десятки различных тыловых организаций,

здесь же находился штаб фронта и т. д. Это же была благодатная почва, на которую просто необходимо было бросить семена правды о войне, просто ненавистной народом. Это стало еще более актуальным после 5 июля 1917 г.»[2]. Кіраўнік Мінскага камітэта РСДРП(б) адзначаў, што яны з цяжкасцю сабралі грошы, купілі білет на цягнік у Петраград і адправілі без усялякай надзеі на поспех у ЦК партыі чалавека, каб папрасіць хоць нейкія грошы на выданне партыйнай газеты. І якое ж іх было здзіўленне, калі праз нейкі час ён вярнуўся з 2 тыс. рублёў, якіх хапіла на выпуск 5-6 нумароў газеты.

Невялікія грошы на выданне з’явіліся, але ўзнікла іншая праблема – як знайсці друкарню, гаспадар якой пагадзіўся б друкаваць газету, якая не будзе падабацца ўладам. Усе яны, напалоханыя, адмаўляліся. Угаварылі ўрэшце рэшт Г. Данцыга, які ў свой час друкаваў «Северо-Западный край». Ён меў невялікую, але добра абсталяваную друкарню, нават з электрычнымі машынамі. Падабралі наборшчыкаў, метранпажа, экспедытара, распаўсюджвальнікаў. Не было праблемы і з назвай газеты: вырашылі даць ёй назву «Звезда» (так у свой час называлася газета сацыял-дэмакратычнай фракцыі ў Дзяржаўнай думе, якую, дарэчы, рэдагаваў наш зямляк К. Ерамееў. – С. Г.).

Першы нумар «Звезды» выйшаў 27 ліпеня 1917 г. накладам у 3 тыс. паасобнікаў. Каштаваў кожны 10 капеек. У Мінску газета была раскуплена за лічаныя гадзіны. А.Мяснікоў успамінаў: «Роль «Звезды» в деле собирания нашей партии была громадная. До того маленькая наша группа с появленнем «Звезды» в течение августа выросла в большую центральную политическую организацию целого края... «Звезда» была тем фокусом, откуда исходили во все стороны как на фронт, так и в провинцию... лучи политического воспитания и общественного преобразования крупных солдатских, батрацких и рабочих элементов Западного края.

...«Звезда» заложила крепкий фундамент нашего здания».[3]

У складзе рэдакцыі газеты працавалі чатыры рэдактары: А. Мяснікоў (Мяснікян), М. Фрунзе, В. Кнорын (Кнорыньш), В.Фамін. «Звезда» выходзіла да 23 жніўня, затым была закрыта ўрадам А. Керанскага. На змену ёй прыйшоў «Молот», які выдаваўся з 15 верасня па 6 кастрычніка. Роля і значэнне выдання павялічыліся: яно стала друкаваным органам бюро Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б). Два першыя нумары «Молота» былі надрукаваны ў друкарні Грынблата, адзінага з уласнікаў мінскіх друкарань, якога ўдалося з цяжкасцю ўгаварыць друкаваць бальшавіцкую газету. Ён жа з вялікай лёгкасцю праз некалькі дзён, як і іншыя, адмовіўся (у сілу вядомых прычын. – С.Г.) друкаваць яе далей. «Молот» затым выходзіў у друкарні Г. Данцыга, у прыватнай

[2] Мясников А.Ф. (Мясникян). Избранные произведения. – М., 1985. С. 49 –50.
[3] Мясников А.Ф. (Мясникян). Избранные произведения. С. 50.

«Рэспубліцы». Да выхаду ў свет газету падпісвала Е. Казлова. Апошні, чатырнаццаты нумар «Молота» , выйшаў у ноч з 5 на 6 кастрычніка 1917 г., практычна ў нелегальных умовах, калі М. Фрунзе тайком гатовы набор з друкарні «Рэспубліка» пераправіў у друкарню «Известий Минского Совета», у якой газета і была надрукавана.

На змену «Молоту» прыйшоў «Буревестник», які выдаваўся з 8 па 29 кастрычніка. Пачынаючы з 15 нумара, газета вяла двайную нумарацыю, тым самым даючы чытачам зразумець, што «Буревестник» з'яўляецца пераемнікам «Звезды» і «Молота». Афіцыйным рэдактарам газеты працаваў В. Пятроў. А. Мяснікоў некалькі ўзнёсла пісаў: «Буревестник» своим названием горячими, коротенькими и меткими статейками возвещал обширному краю и фронту близкий конец невыносимой, предательски тяжёлой духом... эпохи. Друзья, читатели и все последователи «Буревестника» слились в тесный, непрерывный союз работников нового строя. «Буревестник» своей работой… делал последние... взмахи крыльями... Нам пришлось недолго ждать. Наступили Октябрьские дни»[4].

Адразу ж пасля выхаду першага нумара «Буревестника» начальнік штаба Заходняга фронту генерал Вальтэр адправіў тэлеграму на імя начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага з хадайніцтвам аб закрыцці газеты, каб, як ён пісаў, на корані спыніць шкодны ўплыў бальшавікоў на армію. 17 кастрычніка памочнік начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага тэлеграмай за нумарам 633 паведамляў у Мінск аб задавальненні хадайніцтва. 25 кастрычніка Вальтэр ад імя камандуючага Заходнім фронтам уведаміў аб гэтым губернскага камісара і начальніка мінскага гарнізона. Але на самай справе газету сталі ахоўваць салдаты Мінскага Савета і рашэнне аб закрыцці «Буревестника» бальшавікамі не было выканана.

25 кастрычніка 1917 г. у Расіі перамагла сацыялістычная рэвалюцыя, улада перайшла ў рукі Саветаў. 27 кастрычніка «Буревестник» надрукаваў загад № 1 ад 25 кастрычніка Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў «К населению города Минска и окрестностей» аб тым, што ўлада тут перайшла ў рукі Мінскага Савета. 27 кастрычніка выйшаў апошні, 19(54) нумар «Буревестника», а з 1 лістапада 1917 г. газета зноў стала называцца «Звездою».

У «Звезде» («Молоте», «Буревестнике») друкаваліся як прафесійныя аўтары-журналісты, так і запрошаныя. Лік іх пастаянна павялічваўся. І гэта не дзіўна, бо кожны з рэдактараў сам асабіста займаўся адборам з іх ліку найбольш таленавітых. У газету пастаянна пісалі кіраўнікі сацыял-дэмакратычных камітэтаў, прадстаўнікі Саветаў, прафсаюзаў, арміі, дасылалі пісьмы рабочыя, салдаты, прыходзілі рэзалюцыі сходаў,

[4] Мясников А.Ф. (Мясникян). Избранные произведения. С. 53–54.

канферэнцый і г.д. У газеце друкаваліся Б. Позэрн, Л. Любімаў, В. Селязнёў, А. Крыніцкі (Бампі), В. Неўскі, Г. Усцінаў, Р. Пікель, Р. Рэзаўскі, які пачынаў працаваць карэктарам, а затым вырас да пасады рэдактара аддзелаў партыйнага і мясцовага жыцця, С. Шчукін, І. Дзмітрыеў. Наборшчыкамі працавалі Берэнс, Фёдараў, Лебедзеў, метранпажам і выпускаючым Алфёраў, загадчыкам экспедыцыі М. Віглянскі, фальцоўшчыкам і экспедытарам Галкін, рэдакцыя мела дзясяткі дабраахвотных распаўсюджвальнікаў газеты. Многія яе памочнікі ці спачувалі бальшавікам, ці былі сябрамі партыі. Самымі актыўнымі публіцыстамі «Звезды» былі, зразумела, А.Мяснікоў, В. Кнорын, М. Фрунзе і некаторыя іншыя. А.Мяснікоў закончыў юрыдычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Тэматыка яго выступленняў у газеце была самай разнастайнай – ад папулярызацыі праграмы РСДРП(б) і марксісцкай тэорыі да пытанняў распаўсюджвання пралетарскага руху на як мага большы кантынгент удзельнікаў рэвалюцыі, да тлумачэння аграрнай праграмы партыі, паказу ролі прафсаюзаў у жыцці грамадства, пытанняў кааперацыі і фермерства, тлумачэння палітыка-філасофскіх вызначэнняў і г. д. В. Кнорын валодаў некалькімі еўрапейскімі мовамі, ён працаваў у газеце сакратаром і вёў унутраны аддзел і замежны агляд.

«Звезда» прапагандавала праграму партыі бальшавікоў, рашэнні VI з'езда РСДРП(б), тлумачыла палітычную абстаноўку ў краіне, асабліва пасля падзей 3-5 ліпеня, калі стала ясна, што Часовы ўрад будзе да канца трымаць уладу ў сваіх руках і Саветам ён яе ніколі дабраахвотна не перадасць.

15 чэрвеня 1917 г. ваенны і марскі міністр А. Керанскі аддаў загад аб наступленні на ўсіх франтах, якое правалілася. Стаўшы прэм'ер-міністрам (з 8 ліпеня 1917 г.), ён аб'явіў, што Расія будзе працягваць вайну да пераможнага канца. Мілітарысцкі настрой урада на чале з А. Керанскім падтрымалі кадэты, эсэры, меншавікі, бундаўцы. «Звезда» надрукавала рэзалюцыю VI з'езда РСДРП(б), «Бегущий момент и война», шэраг артыкулаў, прысвечаных гэтай хваляваўшай расійскае грамадства праблеме: «Готовятся наступапь» (В. Т-на), «Капитализм и война», «Война и мир» (А. Мяснікова), «Война и Интернационал», «Революция и фронт» Арс. Шуйскага (М. Фрунзе), рэдакцыйныя артыкулы «Наши союзники», «Партия и война», дзясяткі рэзалюцый салдацкіх камітэтаў, пісьмаў рабочых і салдат з патрабаваннямі спыніць ненавісную, бессэнсоўную вайну, якая несла людзям голад і смерць. У газеце друкаваліся работы У. Леніна, у якіх тлумачыўся стан палітычнага і эканамічнага жыцця ў Расіі, распавядалася аб дзейнасці партыйных камітэтаў, аб рабоце бальшавікоў сярод салдат, крытыкаваліся дзеянні Часовага ўрада, на старонках газеты

абмяркоўвалася нацыянальнае пытанне, расказвалася аб падрыхтоўцы да другога, сацыялістычнага этапа рэвалюцыі.

Адной з галоўных у «Звезде» была сялянская тэматыка – арганізацыя сялянскіх камітэтаў, выбары Саветаў сялянскіх дэпутатаў, стварэнне прафсаюзных арганізацый батракоў, увядзенне для іх 8-гадзіннага рабочага дня і інш. У публікацыях «Наша земельная программа», «Одиссея – батраки», «Земля и революционная демократия», «Отношение партий к земельному вопросу» чытачы, у першую чаргу сяляне, бачылі, як бальшавікі імкнуцца вырашаць агарнае пытанне і тое, каму яна будзе належаць, ці будзе зямельнае пытанне вырашацца справядліва.

Напрыканцы ліпеня – на пачатку жніўня 1917 г. Мінскі камітэт РСДРП(б) стварыў выдавецтва «Звезда», якое займалася выпускам брашур, улётак, зваротаў. За кароткі тэрмін у ім выйшла 9 назваў работ, яшчэ 4  рыхтаваліся да выпуску. Сярод выдадзеных былі творы А. К. (А.Калантай) «Кому нужна война?», «Кто такие социал-демократы и чего они хотят», У. Леніна «Земельный вопрос», «К моменту», «Русская революция и гражданская война», «Уроки революции», «Удержат ли большевики государственную власть?», «Политические партии в России и задачи пролетариата», «Письма о тактике», А. Мартуні (А.Мяснікова) «Под красное знамя», а таксама брашуры «Большевики о земле», «Правда о петербургских событиях», кніга апавяданняў М. Горкага, раман Джаваньёлі «Спартак». Акрамя ідэалагічнага і выхаваўчага значэння кніжная прадукцыя выдавецтва прыносіла невялікі прыбытак, частка якога ішла на выданне газеты і новых зборнікаў, частка – на ўтрыманне шпіталяў, санітарны ўход, наладжванне асабістай гігіены і інш.

«Августовская «Звезда» заложила крепкий фундамент нашего здания, – пісаў ва ўспамінах да першай гадавіны газеты А. Мяснікоў. – Стройные коммунистические ячейки и крепкие большевистские организации стали фактом в общественной жизни»[5]. Пасля 5 ліпеня 1917 г., калі бальшавіцкая партыя была вымушана працаваць у падпольных умовах, друкаванае слова стала самай дзейснай яе зброяй. Ідэі РСДРП(б) у жніўні – кастрычніку 1917 г. неслі шырокім масам 75 газет і часопісаў, у тым ліку 25 штодзённых газет, якія выходзілі практычна ва ўсіх важнейшых рэгіёнах і буйных прамысловых цэнтрах агульным тыражом амаль 600 тыс. паасобнікаў у дзень. Сярод іх асобнае месца займала першая легальная бальшавіцкая газета «Звязда» («Молот», «Буревестник»), якая адыграла выдатную ролю ў прапагандзе рэвалюцыйных ідэй у Заходняй вобласці і на Заходнім фронце.

---

[5] Мясников А.Ф. (Мясникян). Избранные произведения. С. 49.